иноязычной речи средствами информационно-коммуникационных технологий: учеб. пособие. Томск: Изд-во Томского ун-та, 2009. 134 с.
4. Кириллова Г. И. Информационные технологии и компьютерные средства в образовании // Educational Technology and Society. 2010. № 4. С. 23-29.
5. Сысоев П. В. Блог-технология в обучении иностранному языку // Язык и культура. 2013. № 4. С. 115-127.

## ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СПОСАБ ДАЛУЧЭННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ РОДНАГА КРАЮ

**Л. А. Пяшко, настаўнік пачатковых класаў**
*ДУА "Сярэдняя школа № 16 г. Пінска", г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

У сучасных умовах незвычайна ўзрасла неабходнасць звароту да духоў-най спадчыны нашага народа, тых багаццяў народнай беларускай культуры, вывучаць якія – першая задача ў маральным і патрыятычным выхаванні мала-дога пакалення. Вывучаючы традыцыі свайго краю, мы далучаемся да сваёй спадчыны, яшчэ раз даказваючы, што без ведання мінулага не можа быць у чалавека будучыні.

Кожны народ імкнецца ведаць сваю гісторыю, свае гістарычныя карані. Гэта неабходна, каб адчуваць не толькі сувязь часоў, але і каб выкарыстоўваць гістарычны вопыт, не паўтараць памылак, а браць з мінулага ўрокі, неабходныя для вырашэння сённяшніх задач. Нельга ўявіць сабе цывілізаванага чалавека, а тым больш грамадзяніна той ці іншай краіны, які б не ведаў гісторыі сваёй Айчыны.

Наша краіна мае багатую гістарычную спадчыну. Мы, беларусы, павінны ведаць сваю гісторыю, свае карані. Як кажуць: "Без мінулага няма

будучыні”. Вывучэнне гісторыі Беларусі ўзмацняе гонар за сваю Радзіму, павагу і любоў да родных мясцін.

Якія формы работы з’яўляюцца найбольш эфектыўнымі? Як сфарміраваць правільнае станаўленне да сваёй краіны, вырасціць пакаленне, гатовае адстойваць інтарэсы роднага краю? Лічу, што патрыятызм грунтуецца на векавых традыцыях нашай краіны.

Галоўная мэта маёй работы: выхаванне павагі да мінулага краіны, пачуцця адказнасці за яе будучыню.

Адным з найбольш эфектыўных форм вывучэння беларускай спадчыны з’яўляецца арганізацыя даследчай работы.“Хай круціцца ганчарны круг”, “Музей у куфры” – гэтыя работы дапамаглі далучыць дзяцей да вывучэння беларускіх традыцый, зразумець, як жылі нашы продкі, якія мудрыя парады яны пакінулі нам.

Мы любім наведваць замежныя краіны, знакамітыя музеі, выставы. Сёння я запрашаю вас у беларускую глыбінку, дзе амаль ля самай беларуска-ўкраінскай мяжы, сярод зялёных лясоў, непраходных балот стаіць вёска Гарадная, знакамітая не толькі на Палессі, але і далёка за межамі нашай краіны. Гэта зямля маіх продкаў. Тут нарадзіўся і жыў мой бацька, мае бабуля і дзядуля, прабабуля і прадзядуля. Тут прайшло маё дзяцінства.

Галоўнае багацце гэтых мест – зямля. Вакол Гарадной размяшчаюцца буйнейшыя ў Беларусі залежы тугаплаўкіх каалінавых глін. У некаторых месцах яе залежы дасягаюць 20 метраў.

Сюды мы прыехалі з дзецьмі, каб знайсці адказы на наступныя пытанні: як можна з камяка гліны зрабіць такі выраб, які шлях праходзіць гліна, пакуль стане посудам, ці можна зрабіць гліняны гаршчок дома, ці ёсць зараз на Палессі ганчары?

Колькі старажытных прафесій сёння забыта, але адна з іх засталася ў нязменным выглядзе. Гэта прафесія ганчара. Перад намі адкрыў свае дзверы Цэнтр ганчарства

З даўніх часоў старажытны чалавек заўважыў, што пры апальванні гліна становіцца цвёрдай. Так узнікла ганчарства – вельмі цяжкае рамяство, вельмі складаная, напружаная праца, якою заўжды займаліся мужчыны.

Праца ганчара – гэта не толькі праца на ганчарным крузе, гэта і нарыхтоўка гліны, і абпальванне вырабаў. Вынік сваёй працы ў многім залежыць ад якасці падрыхтаванай гліны.

У музеі ганчарства дзеці пазнаёміліся з традыцыйныя вырабамі гараднянскіх майстроў.

Як жылі ганчары раней? Адказ на гэта пытанне мы атрымалі, калі наведалі музей-сядзібу ганчара. Мы даведаліся, што раней у гожнага ганчара быў свой горан для абпальвання посуду. А ў хаце для ганчарнай справы адводзілі спецыяльны куток.Сем'і ганчароў былі вялікія, па 5-7 дзяцей. Каб пракарміць такую сям'ю, працаваць прыходзілася шмат. Дарослым дапамагалі старэйшыя дзеці, мастацтву вучыліся змалку.

А колькі радасці было ў дзяцей, калі ім давялось папрацаваць за ганчарным кругам. Як радаваліся яны, калі выходзіла хоць нешта падобнае на місачку, вазачку ці збанок.

Мне вельмі хацелася арганізаваць сустрэчу з мясцовымі ганчарамі, каб дзеці пачулі іх гісторыі. Нам пашанцавала. 74-гадовы майстар Рыгор Іосіфавіч Кавалька не толькі расказаў, але і паказаў нам, як ажывае камяк гліны ў руках майстра. Гэта быў сапраўдны цуд. Дзед Рыгор, так менавіта ён хацеў, каб мы да яго звярталіся, расказаў нам, што раней ганчарствам займаўся кожны другі жыхар вёскі. А цяпер ганчароў можна пералічыць на пальцах. Можа таму, што справа гэта не з лёгкіх, ды яшчэ многа глінянага посуду вырабляюць на фабрыках. Працу чалавека замянілі машыны. Але кожны з нас згадзіцца: найбольш каштоўныя з рэчаў тыя, што зроблены рукамі, асветлены душою чалавека. Вазьміце ў рукі гліняны збанок, кубак, місачку ці гаршчок, яны захоўваюць цеплыню сэрца і душы майстра, які выканаў гэты “твор”.

Мы пераканаліся, што на самай справе працэс стварэнны глінянага вырабу – цяжкі і доўгі. Займае прыкладна каля месяца. А самому мастацтву трэба вучыцца доўгія гады.

А вёска Гарадная і ў наш час не страціла сваёй самабытнасці і непаўторнасці. І той, хто завітае сюды, ніколі не пашкадуе, бо свае старадаўнія традыцыі гараднянскія глінамесы змаглі пранесці праз стагоддзі ажно да нашых дзён.

І да гэтага часу жывуць на гараднянскай зямлі вольналюбівыя і працавітыя людзі, якія не забываюць рамяство сваіх продкаў, шануюць сваю зямлю, упрыгожваюць яе, ахоўваюць родную прыроду. І хоць ганчароў з кожным годам становіцца ўсё менш, застаецца спадзявацца, што ганчарнае кола будзе круціцца заўсёды, а гліна пры гэтым будзе спяваць.

І яшчэ хачу расказаць пра адну сваю даследчую работу “Музей у куфры”. Такія скрыні, як аказалася, ёсць і у нашых бабуль, прабабуль. Толькі хтосьці захоўвае ў ёй жыта, хтосьці старыя анучы, сельскагаспадарчыя інструменты і нават мёд. Мы сталі шукаць адказы на пытані: Але для чаго куфар выкарыстоўваўся раней? Што ў ім трымалі? Дзе ён стаяў?

З энцыклапедый і тлумачальных слоўнікаў мы даведаліся, што слова “куфар”у розных мовах мае розныя значэнні. У нас жа “куфар, скрыня” — драўляная ёмістасць, для захоўвання тканіны, адзення, бялізны і каштоўнасцей; від мэблі.

Дзе сёння можна зазірнуць ў гісторыю нашай краіны і пабачыць, як жылі нашы продкі? Вядома, у музеі. Вось туды мы і накіраваліся. Выстраілася лагічная схема. Продкам куфра з’яўляецца кубел, а яго нашчадкамі – камода і шафа.

Так узнікла ідэя зрабіць “музей у куфры”. Нам на дапамогу прышлі усе вучні разам са сваімі сем’ямі. Майстравалі, красілі, шылі, плялі, вязалі. Вось, што ў нас атрымалася. Ітак, я запрашаю вас апынуцца тады, калі нашы

прабабулі і прадзядулі былі маладымі, а бабулі і дзядулі былі маленькімі хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Жыхары нашай вёскі дапамаглі мне адказаць на пытанне “Што захоўвалі ў куфры?”. Звычайна на самым донцы трымалі святочныя дарожкі, посцілкі на падлогу. Рабілі іх са стужак тканіны, якія плялі, або нават ткалі. Ткацтва -адно з самых старажытных промыслаў беларусаў. На працягу стагоддзяў яно перадавалася з пакаленняў у пакалення. Сыравінай для ткацтва быў лён або авечая воўна. Есць тут і тканыя ручнікі – вечныя спадарожнікі беларуса. Але галоўнае прызначэнне куфра – захоўванне адзежы. Адзенне шылі самі гаспадыні, а галоўным матэрыялам было ільняное сукно. Так у мужчын гэта былі сарочка і штаны. Прычым святочнае адзенне шылася з выбеленай тканіны і упрыгожвалася вышыванкай. У жанчын гэта былі сарочка, спадніца, фартук або кашуля і сарафан. Побач з адзеннем у сялянскім куфры можна знайсці зручны абутак, плецены з лыка, лазовай кары. Лыка дралі найчасцей з маладой ліпы, сушылі на гарышчы хаты. Потым палоскі кары, кабяны не ламаліся, размочвалі ў цёплай вадзе. І плялі лапці, у якіх хадзілі і дарослыя, і дзеці. На галаве жанчыны насілі хустачкі, а дзяўчаты, асабліва на святы, саламяныя вяночкі. Мужчыны – капелюшы.

Дазвольце пазнаёміць вас і з продкам праса – качалкай. Качалка – прыспасабленне для разгладжвання вырабаў з тканіны. Вопратку раскачвалі валікам – гэта драўляны брус з нарэзанымі ўпоперак зубцамі і ручкай. Зубцы размяшчаліся шчыльна адзін каля аднаго.

У наш жа час куфры паступова перасяліліся з хаты ў сенцы ці на гарышча. І, нягледзячы на свой "узрост", працягваюць служыць сваім гаспадарам, і часта выкарыстоўваюцца на розныя гаспадарчыя патрэбы. І ніхто не спяшаецца з ім развітацца.

Гісторыя жыве не толькі ў велічных замках, старажытных збудаваннях, традыцыйных беларускіх святах, але і ў звычайных рэчах і прадметах.

Шануйце нашы традыцыі, купляйце куфры і куфэрачкі — і няхай вам будзе што ў іх пакласці.

Хачу дадаць, што адна з гэтых работ атрымала дыплом III ступені на абласной канферэнцыі, а другая не прайшла і гарадскі этап. Але гэта нікольки не памяншае яе значнасці. Бо тое, што робіцца з душой не можа не закрануць дзіцячае сэрца.

Паважаць сябе і чакаць павагі ад іншых можна толькі тады, калі ведаеш і любіш свой  край. Любіць сябе і чакаць любові ад другіх можна толькі тады, калі любіш людзей, што жывуць у краі тваім. Паважаць і любіць можна толькі тых і толькі тое, што добра табе знаёма.

## ФОРМИРОВАНИЕ МЕТАПРЕДМЕТНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ УЧАЩИХСЯ   НА УЧЕБНЫХ ЗАНЯТИЯХ «ЧЕЛОВЕК И МИР»

**Л. К. Пригодич, учитель начальных классов**

*ГУО «Средняя школа № 16 г. Пинска», г. Пинск, Республика Беларусь*

Стратегия обновления образования с позиций компетентностного подхода обусловила смену приоритетных и целевых установок с формирования у учащихся базовых знаний, умений и навыков на развитие ключевых (метапредметных или надпредметных) компетенций. Учащимся, которые будут жить и трудиться в XXI веке, веке инноваций и новизны, необходимо не просто получить необходимый багаж знаний, а гораздо важнее научиться способам получения знаний, то есть, «научиться учиться». Поэтому в современном образовании актуальны не только вопросы о знаниях овладения учащимися информацией, но и компетенциях как «инструментах», которые помогут учащимся адаптироваться в проблемных жизненных ситуациях.